**Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ЧУТПП «Терра-Нова»**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Капитальное строение, инв. № 200/С-59845 (пилорама), общей площадью 282,0 кв. м, стоимостью 30 560 рублей 00 копеек |
| Собственник (владелец) имущества | ЧУТПП «Терра-Нова» (УНП 300506707) |
| Местонахождение (адрес) имущества | Лот №1. г. Витебск, ул. Полярная, 2 |
| Наличие обременений | Залог ОАО «Белвнешэкономбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 08.12.2017 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Чкалова, 11/13 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска<br>210001, г. Витебск, ул. Чкалова, 11/13<br>Заведующий сектором – Мухина Наталья Михайловна, тел./факс. (80212) 63-64-76, начальник отдела – Зарецкая Елена Витальевна, тел. (80212) 60-84-42 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска р/с №BY38AKBB36429030003282000000, филиал №200 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, УНП 300002505, код банка AKBBBY21200, не позднее 11.00 07.12.2017 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь №493-З от 24.10.2016 «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Могилевоблавтотранс»**

Лот №1: **Капитальное строение с инв. № 700/С-78151 – Склад,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 261,8 кв. м, фундамент – бетонный, стены и перегородки – бетонные, металлические, крыша – шиферная, полы – бетонные. Сведения о земельном участке: здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000002004151 (право постоянного пользования), площадью – 0,9625 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Кулибина, 7. Отдельный земельный участок для обслуживания капитального строения не выделен.

***Начальная цена продажи: 20 202,50 белорусских рублей с учетом НДС***

Лот №2: **Капитальное строение с инв. №700/С-78062 – Здание производственного корпуса,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 947,0 кв. м; фундамент – бетонный, стены и перегородки – крупнопанельные, блочные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – рубероид, пол – бетонный.

**Капитальное строение с инв. №700/С-78063 – Здание склада химпродуктов,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 64,0 кв. м; фундамент – кирпичный, стены – кирпичные, перекрытие – деревянное, крыша – шифер, пол – бетонный.

**Капитальное строение с инв. №700/С-84604 – Мощение асфальтобетонное,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 5029,0 кв. м.

**Капитальное строение с инв. №700/С-54189 – Ливневая канализационная сеть,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, протяженность – 52,8 м; вид прокладки – подземный, материал – чугун, стены – ж/бетон.

**Капитальное строение с инв. №700/С-96454 – Канализационная сеть,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, протяженность – 59,4 м; способ прокладки – подземный, материал – чугун, керамика, стены – ж/бетон.

**Капитальное строение с инв. №700/С-98716 – Ограждение территории,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 276,0 кв. м; состав: забор ж/бетонный, забор блочный, забор кирпичный, ворота железные, ворота железные раздвижные, калитка железная.

Сведения о земельном участке: капитальные строения, входящие в состав лота №2, расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000002004151 (право постоянного пользования), площадью – 0,9625 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Кулибина, 7. Отдельные земельные участки для обслуживания каждого из капитальных строений не выделены.

***Начальная цена продажи: 95 512,81 белорусских рублей с учетом НДС***

Лот №3: **Капитальное строение с инв. №700/С-56312 – Материальный склад,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 1564,0 кв. м; фундамент – ж/бетонный, стены и перегородки – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – рулонная, совмещенная, пол – бетонный, дощатый.

**Капитальное строение с инв. №700/С-78152 – Склад,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 5,2 кв. м; стены – металлические, крыша – металлическая.

Сведения о земельном участке: капитальные строения, входящие в состав лота №3, расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000002004151 (право постоянного пользования), площадью – 0,9625 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Кулибина, 7. Отдельные земельные участки для обслуживания каждого из капитальных строений не выделены.

***Начальная цена продажи: 82 069,60 белорусских рублей с учетом НДС***

Лот №4: **Капитальное строение с инв. №700/С-56311 – Административное здание,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 251,8 кв. м; фундамент – кирпичный, стены и перегородки – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – совмещенная, пол – бетонный, дощатый. Сведения о земельном участке: здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000002004151 (право постоянного пользования), площадью – 0,9625 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Кулибина, 7. Отдельный земельный участок для обслуживания капитального строения не выделен.

***Начальная цена продажи: 50 300,00 белорусских рублей с учетом НДС***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,<br>р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 8 декабря 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 7 декабря 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в течение 10 рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи |

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 07.08.17 и 03.10.17

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14; 8 029 624-26-25; 8 044 738-18-99**


# ГУЛЬНІ ВАКОЛ ТРОНА

## Як у Саудаўскай Аравіі змагаюцца з карупцыяй?

**Саудаўская Аравія нязменна ў «топе» стужак навін сусветных інфармагенцтваў. Але ў лістападзе паведамленні пра падзеі ў каралеўстве, напэўна, пабілі ўсе рэкорды па наведвальнасці. Прычынай таму — беспрэцэдэнтная па маштабах антыкарупцыйная кампанія, якая распачалася ў найбуйнейшай краіне Аравійскага паўвострава. Генеральны пракурор Саудаўскай Аравіі Сауд аль-Мужыб заявіў аб затрыманні больш чым 200 чалавек у рамках расследавання карупцыйных спраў. Як паведамляе The Wall Street Journal, спасылаючыся на ўласныя крыніцы, урад краіны мае намер канфіскаваць у затрыманых прынцаў, міністраў, чыноўнікаў і бізнесменаў актывы на суму да $800 млрд і пусціць гэтыя сродкі на пакрыццё дэфіцыту бюджэту краіны, які ўтварыўся пасля падзення цэн на нафту. Афіцыйныя крыніцы пакуль устрымліваюцца ад падрабязных каментарыяў. Што адбываецца ў Саудаўскай Аравіі?**

### НОЧ ДОЎГІХ ХАНДЖАРАЎ

4 лістапада кароль Саудаўскай Аравіі Салман ібн Абдул-Азіз Аль Сауд абвясціў аб стварэнні антыкарупцыйнага камітэта, які ўзначаліў наследны прынц каралеўства Мухамад бен Салман. Ужо ўвечары гэтага дня адбылася «ноч доўгіх кінжалаў» (а дакладней ханджараў — так на Аравійскім паўвостраве называецца мясцовы варыянт кінжала). Падчас маштабнай спецаперацыі, якая ўключала ў сябе блакаванне аэрапортаў і ўзяцце пад ахову найважнейшых аб'ектаў краіны, прайшлі масавыя затрыманні саудаўскай эліты. А ўжо на наступны дзень стала вядома, што ўлады арыштавалі 11 прынцаў, чатырох дзейных міністраў і дзясяткі былых міністраў па падазрэнні ў карупцыі. Антыкарупцыйны камітэт надзелены правам арышту, увядзення забароны на перасячэнне мяжы, а таксама замарозкі актываў на тэрыторыі каралеўства. Згодна з указам караля камітэту даручана аднавіць расследаванне па дзвюх справах: па факце паводкі ў Джэда ў 2009 годзе, а таксама па ліквідацыі наступстваў блізкаўсходняга рэспіраторнага сіндрому.

Поўны спіс імёнаў арыштаваных невядомы, аднак, па даных крыніц, у ліку затрыманых апынуўся адзін з найбагацейшых людзей планеты — прынц і пляменнік цяперашняга караля Аль-Валід ібн Талал Аль Сауд. Часопіс Forbes ацэньвае яго капітал у 17,2 мільярда долараў, Аль-Валід — найбагацейшы чалавек каралеўства. Яму належыць 95 працэнтаў акцый у Kingdom Holding Co., праз якую ён валодае пакетамі акцый у Citigroup (каля 6 працэнтаў), разам з Білам Гейтсам з'яўляецца ўладальнікам асноўнага пакета кампаніі, якая кіруе гатэлямі Four Seasons, таксама яму належаць долі ў Apple, Twitter, XXIst Century Fox, Disney. Дзякуючы свайму капіталу прынц карыстаўся адноснай незалежнасцю ад каралеўскай сям'і. Ён нярэдка дазваляў сабе гучныя выказванні, напрыклад, Аль-Валід раскрытыкаваў ідэю публічнага размяшчэння акцый Saudi Aramco — адзін з сістэмаўтваральных пунктаў плана «Бачанне-2030», які адстойвае наследны прынц Мухамад.

### МЫЦЦЁ БЯЛІЗНЫ

Таксама стала вядома і аб арышце брата былога тэрарыста №1 Усамы бен Ладэна — Бакра бен Ладэна. Яны добра знаёмыя з Аль-Валідам, брат тэрарыста валодае адной з найбуйнейшых у Аравіі будаўнічых фірмаў — Saudi Binladin Group, якая ўзводзіць для прынца Аль-Валіда адзін з найвышэйшых будынкаў у свеце — Kingdom Tower — непадалёк ад Джэда.

Паралельна з арыштамі ад пасады быў вызвалены кіраўнік Нацыянальнай гвардыі — сын папярэдняга караля Абдалы прынц Міцеб. Мухамад атрымаў поўны



кантроль над усімі сілавымі структурамі ў краіне. Зрэшты, масавыя арышты ў Аравіі праходзяць не першы раз. У верасні з падачы наследнага прынца былі арыштаваныя больш за дзесяць уплывовых рэлігійных дзеячаў каралеўства.

Кароль Салман сына публічна падтрымаў, заявіўшы, што ў краіне пачалася маштабная антыкарупцыйная кампанія. Сярод абвінавачанняў, што прад'яўляюцца затрыманым, называюцца ў тым ліку адмыванне грошай, злоўжыванне ўладай, хабарніцтва і растраты. Шэраг асоб «паставілі асабістыя інтарэсы вышэй за грамадскія і сталі красці з дзяржаўных фондаў», — гаворыцца ў прэс-рэлізе Нацыянальнага антыкарупцыйнага камітэта. Назіральнікаў здзіўляе не толькі маштаб гэтай кампаніі (цяперашнія арышты «віпаў» — самыя масавыя з моманту заснавання каралеўства), але і беспрэцэдэнтны ўзровень публічнасці. Ніколі яшчэ кіраўніцтва каралеўства не дазваляла сабе ладзіць такое мыццё бялізны на публіцы. Аднак для экспертаў у гэтым няма нічога незвычайнага — дзеянні цалкам чаканыя. Больш за тое, яны былі вельмі неабходныя кронпрынцу Мухамеду для таго, каб стаць каралём.

### ТУРМА Ў ГАТЭЛІ

Праўда, адпраўляць найвышэйшых прадстаўнікоў улады ў мясцовую турму дзяржава не стала. Як мяркуецца, арыштаваных размясцілі ў 5-зоркавым гатэлі прэміяльнага класа ў цэнтры сталіцы. Інтэр'ер тут амаль як у замку: падлогі і лесвіцы зроблены з мармуру, сцены дэкарыраваны мазаікай, а на столях вісяць шмат'ярусныя люстры ў выглядзе каскада. Хол упрыгожвае мэбля з рэдкіх парод дрэва, абцягнутая сінім аксамітам, жывыя расліны ў дызайнерскіх вазах і калоны, дэкараваныя скульптурамі коней. Дызайн нумара залежыць ад яго статусу, у самым простым варыянце прадугледжаны стандартны набор мэблі, ВК-тэлевізар, тапачкі і халат. Для больш заможных гасцей ёсць варыянты з прасторным кабінетам, абсталяваным дарагой мэбляй, і сталовай, разлічанай на 12 персон.

У гатэлі 6 рэстаранаў, дзе акрамя шведскага стала можна заказаць стравы ліванскай, італьянскай і кітайскай кухні. Сярод забаў велізарны басейн з купалападобным дахам і вокнамі ад падлогі да столі, адкуль адкрываецца від на ландшафтныя сады, спа-зона плошчай каля 18 тыс. кв. м., фітнес-цэнтр і 6 дарожак для боўлінга, дзе пастаяльцы гатэля могуць пакаштаваць безалкагольныя і фруктовыя express кактэйлі.

Адасляць прадстаўнікоў каралеўскай крыві адразу ж у турму азначала б грэбаванне сямейным патрыярхатам, што непазбежна пацягне за сабой наступствы. Справа ў тым, што Саудаўская Аравія кіруецца некалькімі галінамі каралеўскай улады, якія часам канкурыруюць адна з адной. Па словах аднаго з мясцовых высокапастаўленых чыноўнікаў, якія цытуе The Guardian, гатэль — самае зручнае рашэнне праблемы.

### МІСТАР УСЁ

Маладога спадкаемцу ўжо назвалі «саудаўскім Сталіным» з-за схільнасці да інтрыг, стаўкі на прымяненне сілы і нечалавечага напору ў паводзінах. Мухамад бен Салман Аль Сауд, першы сын цяперашняга караля Саудаўскай Аравіі Салмана ад трэцяга шлюбу, невыпадкова з'яўляецца ідэолагам маштабных рэформаў у краіне. Дзякуючы выдатным здольнасцям ён перамог усіх шматлікіх братоў, а таксама дзядзькаў і кузэнаў у барацьбе за тытул наследнага прынца. Яшчэ летась наследным прынцам быў пляменнік караля Салмана Мухамад ібн Наіф Абдул-Азіз Аль Сауд, траюрадны брат Мухамада. Кароль памяняў сваё рашэнне адносна нядаўна — 21 чэрвеня, зняўшы пажылога Мухамада дзеля яго маладога цёзкі. Мухамаду бен Салману Аль Сауду, які стаў другім чалавекам у краіне, споўніўся 31 год. Ён паспеў пабываць намеснікам прэм'ер-міністра, міністрам абароны, кіраўніком каралеўскага суда, кіраўніком савета па эканамічных пытаннях і кіраўніком найбуйнейшай у свеце нафтавай кампаніі Saudi Aramco. За вялізную зону адказнасці і масу пасад, якія Мухамад займае адначасова, заходнія дыпламаты празвалі яго Mr. Everything (літаральна з англійскай — «містар Усё»).

«Ён фактычна выконвае функцыі караля. Аднак для афіцыйнага ўступлення на трон патрэбныя не толькі фармальныя пасады, але і прыняцце (хай фармальнае) яго фігуры большасцю членаў каралеўскай сям'і», — заўважыла «Эксперту Online» арабіст, супрацоўнік МДІМА Таццяна Цюкаева. А з гэтым ёсць праблемы — занадта малады прынц занадта высока ўзляцеў з пункту гледжання кансерватыўнай саудаўскай сям'і, а да таго ж паводзіць сябе надзвычай дзёрзка. Спадчыннік трона рыхтуе маштабныя рэформы, якія закрануць эканамічную і сацыяльна-палітычную сферы. Гаворка ідзе аб мадэрнізацыі каралеўства, адмове ад радыкальнага вектара ў грамадскім жыцці. Мухамад абвясціў маштабную праграму ліберальных эканамічных рэформаў («Бачанне-2030»), мяркуе прадаць на рынку 5% акцый саудаўскай нафтавай кампаніі Aramco. У якасці кіраўніка Дзяржаўнага інвестыцыйнага фонду Мухамед бен Салман у канцы кастрычніка афіцыйна абвясціў аб запуску праекта NEOM — свайго роду «глабальнай вёскі» ў мініяцюры плошчай больш за 25 тысяч квадратных кіламетраў, дзе будуць жыць і працаваць тысячы спецыялістаў у самых розных галінах. Саудаўскае каралеўства і замежныя інвестары збіраюцца ўкласці ў праект паўтрыльёна долараў, што толькі крыху менш за ВУП каралеўства ў мінулым годзе.

Прынц паведаміў рэпарцёрам, што 70% насельніцтва Саудаўскай Аравіі маладзейшыя за 30 гадоў, і гэтыя людзі хочуць «жыцця, у якім наша рэлігія — сінонім талерантнасці». «Мы вяртаемся да таго, чым былі раней — краіна памяркоўнага ісламу, адкрытая для ўсіх рэлігій, традыцый і людзей з усяго свету», — сказаў ён на сустрэчы з інвестарамі ў канцы кастрычніка. Сярод незадаволеных пераўтварэннямі — перш за ўсё кланы, якія адціснуты ад улады (іх прадстаўнікі знятыя са значных пасад у каралеўстве), а таксама кансерватыўная рэлігійная вярхушка, у прыватнасці прадстаўнікі Савета ўлемаў, чые паўнамоцтвы і ўплыў Мухамад імкнецца абмежаваць. Пакуль яму ўдалося выйграць першы тайм вялікай партыі, прычым з сухім лікам, але што будзе далей, заўважаюць эксперты, уявіць складана.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*